# ВАЙНА Ў ДЗІЦЯЧЫМ СЭРЦЫ
# (на прыкладзе твораў беларускай літаратуры ХХ ст.)

***В. Б. Несцяровіч**, кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры рускай мовы як замежнай*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*
*культуры і мастацтваў*

Прайшло амаль 75 гадоў з дня заканчэння Вялікай Айчыннай вайны, а ўспаміны аб ёй не сціраюцца з памяці франтавікоў, якія прайшлі праз гэтае пякельнае полымя. Не забываюць вайну і тыя, чыё дзяцінства прыпала на гэтыя жудасныя і адначасова гераічныя гады. Вайна, трагічная, шматпакутная, устае перад іх вачамі, нагадвае, колькі намаганняў, неймаверных ахвяр, людскіх жыццяў каштавала нашаму народу Перамога.

Вобразнае асэнсаванне трагічных і драматычных падзей Вялікай Айчыннай вайны, пачатае К. Чорным, а крыху пазней – І. Мележам, І. Шамякіным, было ўзнята на больш высокі ўзровень А. Адамовічам, Я. Брылём, В. Быкавым, І. Навуменкам, І. Чыгрынавым, І. Пташнікавым, В. Карамазавым, В. Казько, А. Кудраўцом, Б. Сачанкам, М. Стральцовым, С. Алексіевіч, В. Адамчыкам і іншымі, якіх немагчыма ўсіх назваць. Тых празаікаў, якія не пісалі пра вайну, у беларускай літаратуры адзінкі.

Дамінантнай асаблівасцю беларускай «ваеннай» прозы можна лічыць яе «сінтэтычны» характар, пісьменнікі пры адлюстраванні драматычных падзей становяцца адначасова гісторыкамі, псіхолагамі, этнографамі.

У сярэдзіне 1970-х гадоў была апублікавана дакументальная кніга А. Адамовіча, Я. Брыля, У. Калесніка «Я з вогненнай вёскі...», у якой распавядаецца пра вайну як найвялікшую трагедыю для беларускага народа. Апавяданні, маналогі людзей, якія цудам выратаваліся «з вогненных вёсак», уражваюць сваёй шчырасцю і эмацыянальнасцю, незвычайнай інфармацыйнай насычанасцю. Так пра вайну як злачынства супраць чалавечнасці яшчэ не расказвалася ў сусветнай літаратуры. У гэтым маштабным па адлюстра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ванні ваенных падзей творы наратарамі з'яўляюцца людзі, якія ў трагічныя саракавыя самі былі дзецьмі.

Што можа быць страшнейшае за вайну? А дзеці на вайне? Што можа быць даражэйшае за жыццё дзяцей, за слязіну на іх павейках (прыгадаем афарызм Ф. Дастаеўскага)? А хто падлічыць, колькі дзіцячых жыццяў забіраюць войны? А колькі тых, у каго вайна забрала дзяцінства, хто рана стаў дарослым? Ці засталося дзіцем тое дзіця, якое прайшло праз жахі і пакуты вайны? Адным з першых да асэнсавання зменаў, якія ўнесла вайна ў дзіцячую псіхалогію, звярнуўся Пімен Панчанка, увёўшы тэрмін «дзеці вайны» ў аднайменным вершы, датаваным 1942 годам:

Ім не спявалі маткі калыханкі,
Яны не чулі казак ад дзядоў,
Палохаў іх ахрыплы голас танка,
Трывожыў іх журботны ёнк удоў.
Яны не плакалі бяссоннымі начамі,
Калі ад бомбаў неслі іх у склеп.
І словы першыя, якім іх навучылі,
Былі пра немцаў, пра вайну і хлеб [2].

Паэт з горыччу сцвярджае, што нават пасля вайны ў сны, мары і душы знявечаных вайной дзяцей будуць урывацца водгукі мінулага:

Заціхнуць бітвы. Вораг будзе знішчан.
І дзеці прычакаюць таго дня,
Калі з-пад воблака ўпадзе на папялішчы,
Як цёплы дождж, густая цішыня.
Нясмела з хат яны у поле выйдуць,
Каб першы раз спакойна у жыцці
Палюбавацца родным краявідам,
Паслухаць звон рачулкі у трысці.
Пі пах лугоў, красой гаёў любуйся!
І ўсё ж іх сэрцы задрыжаць не раз:
Ім здасца самалётам першы бусел,
Пажарам здасца першая зара.
Лагодны гром за дальняю дубровай
Напомніць ім пра жах бамбардзіровак.
І часта, часта ў чыстыя іх сны
Ўрывацца будуць галасы вайны [2].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вялікай увагай да раскрыцця ваенных падзей праз дзіцячае ўспрыманне характарызуюцца мастацкія пошукі паэтаў і празаікаў, чыё дзяцінства было абпалена вайной (Я. Сіпакоў, А. Вярцінскі, М. Стральцоў, В. Казько, Б. Сачанка і інш.). Віктар Казько паказаў вайну праз дзіцячае ўспрыманне. Маленькім хлопчыкам яму давялося перажыць шмат цяжкіх выпрабаванняў. Бацька яго загінуў у барацьбе з фашыстамі, а ў 1943 годзе ад выбуху варожага снарада загінула і маці. Сам маленькім дзіцем аўтар аповесці «Суд у Слабадзе» трапіў у лагер смерці ў Азарычах, адкуль яго забрала старая бабуля. Вось як прыгадваў пісьменнік дарогу дадому: «Хадзіць я ўжо сам не ўмеў, я ішоў ужо па дарозе небыцця. Бабуля несла мяне на плячах. Перад сваёй вёскай вырашыла спрасціць, пайшла напрасткі, па полі, стамілася». Яго бабуля тады трапіла на міннае поле і прайшла цераз яго з унукам на плячах.

Паказу вайны вачыма дзяцей прысвечана аўтабіяграфічная аповесць Віктара Казько «Суд у Слабадзе» (аднак сам аўтар адзначаў, што галоўнаму герою твора ён надаў рысы некалькіх сяброў па дзетдоме). Герой аповесці – Колька Лецечка, малы хлопчык, выхаванец дзіцячага дома, беспрытульнік, які не памятаў ні свайго імя, ні прозвішча. Менавіта праз яго адчуванні падаюцца ўсе жахі і злачынствы фашыстаў, што прыйшлі на нашу зямлю.

Дзетдомавец з мястэчка Слабада неаднаразова задае сабе пытанні, у якіх, поруч з наіўна-дзіцячым «чаму»? – дарослая трывога: «Адкуль ён такі – як ёсць, і яшчэ – навошта, дзеля чаго? Парадзіла яго на свет маці. А што гэта такое – маці? Цішыня, пустэча была яму за гэтым словам, якісьці туман: бацька, матка... З чаго гэта толькі ён сам?» [1, с. 178]. Пытанні гэтыя зусім не рытарычныя, бо Колька Лецечка не памятае ні свайго ранняга дзяцінства, ні абставін, якія непазнавальным чынам змянілі яго лёс. Перадумова да вырашэння гэтых пытанняў – успышка памяці, успамін пра страшныя дні, праведзеныя ў «кіндэрхайме» – «дзіцячым доме», адным з тых, што існавалі на акупіраваных немцамі землях, дзе ў дзяцей забіралі кроў для параненых нямецкіх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

салдат. Дзеці ніяк не маглі абараніцца, бо іх рукі і ногі былі прывязаныя да стала. Так фашысты асуджалі на вялікія пакуты і смерць ні ў чым не павінных дзяцей. Пісьменнік прызнаецца: «Мне часам гавораць, што ўсё, пра што я расказваю, успамінаю, я прыдумаў. У чатыры, нават у пяць–шэсць гадоў я не мог бы столькі запомніць. Але я сам помню ўсё. І гэта цяжка». І цяжка, і страшна тое, што помніць герой яго аповесці Колька Лецечка. Таму што больш жахлівага за тую дзіцячую памяць нічога на зямлі не было і не магло ўжо быць...

У Колькі Лецечкі таксама была вялікая прага жыцця. Але як яму жыць далей з памяццю пра зверствы і нялюдскасць фашыстаў, з тым, што ў кожным чалавеку ён будзе бачыць тую «чорную малпу», а кожная чалавечая рука, якая працягнута да яго з мэтай абараніць ад небяспекі будзе асацыіравацца ў яго свядомасці з агіднай змяёй?

Аднак, нягледзячы на выпрабаванні, праз якія яму давялося прайсці, Колька захаваў у сэрцы дабрыню і чуйнасць. Нават на суд, які адбываецца ў Слабадзе над былымі паліцаямі, ён прыходзіць не з мэтай помсты (у дадзеным выпадку ён з'яўляецца антыподам вартаўніка Захарыя, у якога вайна адабрала сям'ю, таму ён прагне крывавай помсты карнікам), а як жывы сведка жахлівых падзей, у якога нават смяротны прысуд карнікам не выклікае палёгкі. Ды жыць далей не хапае не толькі фізічных сіл. Вайна псіхалагічна «забіла» Кольку, які не змог ачуняць пасля ўспамінаў-выбухаў, не здолеў знайсці свайго месца ў свеце, зруйнаваным ёю, дысгарманічным і алагічным. Перад смерцю падлетак дорыць сябрам-дзетдомаўцам свае «скарбы», перамагае ў сабе крыўду і нянавісць. Менавіта па гэтай прычыне яго смерць адбываецца ўранку: «Ён больш не будзе чакаць усходу сонца, прыспешваць заўтра. Яго заўтра ўжо надышло, апошняе і такое, за якім няма ўжо страху памерці. Мужчыны не плачуць… А слёзы ішлі… І памёр Колька Лецечка наступным ранкам. На сваім любімым ганку. На ўсходзе сонца. Калі дзетдом яшчэ спаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Калі спаў яшчэ горад. Памёр лёгка і нечакана, як паміраюць дзеці» [1, с. 217].

Вайна пакінула незагойную рану ў дзіцячых сэрцах. Яны старэйшыя за сваю дзіцячую памяць: калі дарослая памяць дае аб'ёмны малюнак мінулага, то ў дзіцячую переажытае ўразаецца ўспышкамі, выхопліваючы найбольш яркія, трагічныя і жудасныя моманты вайны. У дзіцячых дамах Беларусі ў 1945 годзе выхоўвалася 26 тысяч 900 сірот. Паказ вайны праз дзіцячае ўспрыманне яшчэ больш адцяняе яе жорсткасць і бязлітаснасць, а творы становяцца асабліва пранізлівымі, шчымлівымі, трагедыйнымі, нагадваюць незагойную рану, нанесеную дзіцячай свядомасці.

Па драматызме перажыванняў, сіле душэўнай адзіноты, адрынутасці ад жыцця вобраз Колькі Лецечкі блізкі да вобраза Яся Панявежы – галоўнага героя аўтабіяграфічнай аповесці Б. Сачанкі «Апошнія і першыя». Твор перадае душэўныя зрухі і псіхалагічны стан хлопчыка, дзяцінства якога было паранена вайной: «Я хацеў бы, каб гэта быў сон. Але гэта не сон. Не, не сон…» [3].

Аўтабіяграфічныя аспекты жыццёвага шляху Віктара Казько і Барыса Сачанкі ўвасабіліся ў аповесцях «Суд у Слабадзе» і «Апошнія і першыя». Вобразы дзяцей у іх надзелены вострым, болевым успрыманнем свету, крайняй праўдзівасцю перад сабой і іншымі, няўтольнай смагай да дабра і жыцця, нянавісцю да зла, пачуццём адказнасці і трывогі за чалавецтва.

1. *Казько, В.* Суд у Слабадзе / В. Казько. – Мінск : Маст. літ., 2007. – 239 с.

2. *Панчанка, П.* Дзеці вайны [Электронны рэсурс]. – Рэжым звароту: http://vershy.ru/content/dzetsi-vainy. – Дата звароту: 01.03.2019.

3. *Сачанка, Б.* Апошнія і першыя [Электронны рэсурс]. – Рэжым звароту: http:// http://knihi.com/Barys_Sacanka/Aposnija_i_piersyja.html#1. – Дата звароту: 05.03.2019.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ